ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМАЎ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 32 (519) | Субота, 20 лістапада 1982 года. | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.

## ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ПАВЕДАМЛЕННЕ

### аб Пленуме Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Савецкага Саюза

12 лістапада 1982 года адбыўся нечарговы Пленум Цэнтральнага Камітэта КПСС.

Па даручэнню Палітбюро ЦК Пленум адкрыў і выступіў з прамовай член Палітбюро ЦК КПСС, сакратар ЦК КПСС тав. Андропаў Ю. У.

У сувязі са смерцю Генеральнага сакратара ЦК КПСС, Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР Л. І. Брэжнева члены Пленума ЦК ушанавалі памяць Леаніда Ільіча Брэжнева мінутай журботнага маўчання.

Пленум ЦК адзначыў, што Камуністычная партыя, савецкі народ, усё прагрэсіўнае чалавецтва панеслі цяжкую ўтрату. Абарвалася жыццё выдатнага дзеяча Камуністычнай партыі, Савецкай дзяржавы, міжнароднага камуністычнага, рабочага і нацыянальна-вызваленчага руху, палымянага змагара за мір.

Леанід Ільіч Брэжнеў, знаходзячыся ў радах ленінскай Камуністычнай партыі больш як 50 гадоў, з іх 18 гадоў на пасадзе яе кіраўніка, унёс велізарны ўклад ва ўмацаванне магутнасці яе радоў, палітычнай, сацыяльна-эканамічнай і абароннай магутнасці Савецкага Саюза. Выключна вялікая яго роля ва ўмацаванні міру і міжнароднай бяспекі. Імя Леаніда Ільіча Брэжнева, з якім непасрэдна звязаны вялікія здзяйсненні ў жыцці нашай краіны, — індустрыялізацыя і калектывізацыя сельскай гаспадаркі, гістарычная перамога савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, пасляваеннае аднаўленне народнай гаспадаркі нашай Радзімы, даследаванне космасу, усе поспехі ў развіцці эканомікі, навукі і культуры Савецкай дзяржавы, назаўсёды ўвайшло ў гісторыю Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, нашай вялікай Радзімы.

Удзельнікі Пленума ЦК выказалі глыбокае спачуванне родным і блізкім памёршага.

Пленум ЦК разгледзеў пытанне аб выбранні Генеральнага сакратара ЦК КПСС.

Па даручэнню Палітбюро ЦК выступіў з прамовай член Палітбюро ЦК КПСС, сакратар ЦК КПСС тав. Чарненка К. У. Ён унёс прапанову выбраць Генеральным сакратаром ЦК КПСС тав. Андропава Ю. У.

Генеральным сакратаром Цэнтральнага Камітэта КПСС Пленум аднагалосна выбраў тав. Андропава Юрыя Уладзіміравіча.

Затым на Пленуме выступіў Генеральны сакратар ЦК КПСС тав. Андропаў Ю. У. Ён выказаў сардэчную падзяку Пленуму ЦК за аказанае высокае давер'е — выбранне яго на пасаду Генеральнага сакратара ЦК КПСС.

Тав. Андропаў Ю. У. запэўніў Цэнтральны Камітэт КПСС, Камуністычную партыю, што прыкладзе ўсе свае сілы, веды і жыццёвы вопыт для паспяховага выканання вызначаных у рашэннях XXVI з'езда КПСС праграмы камуністычнага будаўніцтва, забеспячэння пераемнасці ў вырашэнні задач далейшага ўмацавання эканамічнай і абароннай магутнасці СССР, павышэння дабрабыту савецкага народа, умацавання міру, у ажыццяўленні ўсёй ленінскай унутранай і знешняй палітыкі, якая праводзілася пры Л. І. Брэжневе.

На гэтым Пленуме закончыў сваю работу.

## ЮРЫЙ УЛАДЗІМІРАВІЧ АНДРОПАЎ



Юрый Уладзіміравіч Андропаў нарадзіўся 15 чэрвеня 1914 года ў сям'і чыгуначніка на станцыі Нагуцкая Стаўрапольскага краю. Адукацыя вышэйшая. Член КПСС з 1939 года.

Шаснаццацігадовым камсамольцам Ю. У. Андропаў быў рабочым у г. Маздок Паўночна-Асецінскай АССР. Затым яго працоўная біяграфія працягвалася на суднах Волжскага параходства, дзе ён працаваў матросам.

З 1936 года Ю. У. Андропаў — на камсамольскай рабоце.

Ён быў выбран вызваленым сакратаром камсамольскай арганізацыі тэхнікума воднага транспарту ў г. Рыбінску Яраслаўскай вобласці. У хуткім часе яго вылучылі на пасаду камсорга ЦК ВЛКСМ суднаверфі імя Валадарскага ў г. Рыбінску. У 1938 годзе камсамольцы Яраслаўскай вобласці выбіраюць Ю. У. Андропава першым сакратаром Яраслаўскага абкома ВЛКСМ. У 1940 годзе Ю. У. Андропаў выбіраецца першым сакратаром ЦК ЛКСМ Карэліі.

З першых дзён Вялікай Айчыннай вайны Ю. У. Андропаў — актыўны ўдзельнік партызанскага руху ў Карэліі. Пасля вызвалення ў 1944 годзе горада Петразаводска ад фашысцкіх захопнікаў Ю. У. Андропаў — на партыйнай рабоце. Ён выбіраецца другім сакратаром Петразаводскага гаркома партыі, а ў 1947 годзе — другім сакратаром ЦК Кампартыі Карэліі.

У 1951 годзе Ю. У. Андропаў па рашэнню ЦК КПСС пераводзіцца ў апарат ЦК КПСС і назначаецца інспектарам, а затым загадчыкам пададдзела ЦК КПСС.

У 1953 годзе партыя накіроўвае Ю. У. Андропава на дыпламатычную работу. Некалькі гадоў ён з'яўляўся надзвычайным і паўнамоцным паслом СССР у Венгерскай Народнай Рэспубліцы.

У 1957 годзе Ю. У. Андропаў быў назначан загадчыкам аддзела ЦК КПСС.

На XXII і наступных з'ездах партыі Ю. У. Андропаў выбіраецца членам Цэнтральнага Камітэта КПСС.

У 1962 годзе Ю. У. Андропаў выбіраецца сакратаром ЦК КПСС.

У маі 1967 года Ю. У. Андропаў назначаецца старшынёй Камітэта дзяржаўнай бяспекі пры Савеце Міністраў СССР. У чэрвені таго ж года ён выбран кандыдатам у члены Палітбюро ЦК КПСС.

У маі 1982 года Ю. У. Андропаў быў выбран сакратаром ЦК КПСС.

З красавіка 1973 года Ю. У. Андропаў — член Палітбюро ЦК КПСС.

Юрый Уладзіміравіч Андропаў — дэпутат Вярхоўнага Савета СССР рада скліканняў.

На ўсіх пасадах, дзе па волі партыі працаваў Ю. У. Андропаў, праяўлялася яго адданасць вялікай справе Леніна, партыі. Ён аддае ўсе свае сілы, веды і вопыт ажыццяўленню рашэнняў партыі, барацьбе за перамогу камуністычных ідэй.

За вялікія заслугі перад Радзімай Ю. У. Андропаву — вядомаму дзеячу Камуністычнай партыі і Савецкай дзяржавы — у 1974 годзе прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы. Ён узнагароджан чатырма ордэнамі Леніна, ордэнамі Кастрычніцкай Рэвалюцыі, Чырвонага Сцяга, трыма ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга і медалямі.

*У парткоме*

## ПРЫНЯТАЯ ПАСТАНОВА — НА КАНТРОЛІ

Задача савецкай вышэйшай школы — даць выпускніку не толькі асноўную, працоўную спецыяльнасць, але і адну з грамадскіх. Набыць яе можна на факультэце грамадскіх прафесій. Работа гэтага падраздзялення ў кожнай ВНУ няўхільна ўдасканальваецца, пашыраюцца яе рамкі. Асабліва прыкметны зрух у важнай справе быў зроблены пасля прыняцця Калегіяй Мінвуза СССР, Калегіяй Міністэрства культуры СССР, Сакратарыятам ВЦСПС і ЦК ВЛКСМ сумеснай пастановы ад 14 красавіка 1980 года па ўдасканальванню работы факультэтаў грамадскіх прафесій у вышэйшых навучальных установах. У святле данай пастановы у свой час была абмеркавана работа ФГП нашага універсітэта на пасяджэнні партыйнага камітэта. У прынятай пастанове прадугледжваліся меры па істотнаму паляпшэнню падрыхтоўкі грамадскіх кадраў. Аб ходзе выканання гэтай пастановы ішла размова ў мінулую сераду на чарговым пасяджэнні парткома. Пра ўсё станоўчае, што зроблена для паляпшэння дзейнасці адкрытых аддзяленняў ФГП, а таксама аб маючых месца недахопах гаварыў дэкан факультэта грамадскіх прафесій А. І. Канашэвіч. Сваімі думкамі па абмяркоўваемаму пытанню падзяліліся члены парткома: яго сакратар М. І. Старавойтаў, намеснік сакратара партыйнага камітэта па арганізацыйнай рабоце Я. А. Семянчук, намеснік сакратара партбюро гістфіла Г. С. Еўдакіменка, намеснік сакратара камітэта ЛКСМБ У. А. Чмых.

Прынятая парткомам пастанова накіравана на далейшае ўдасканальванне ўсіх форм работы ФГП.

## ПЯЦІКУРСНІКІ ЗДАЮЦЬ ЭКЗАМЕНЫ

Адказная пара цяпер у студэнтаў выпускных курсаў матэматычнага, фізічнага і эканамічнага факультэтаў. У вучобе яны, як кажуць, выйшлі на фінішную прамую. Апошняя залікова-экзаменацыйная сесія, апошнія практыкі...

Першымі здавалі залікі і экзамены сваёй апошняй вучэбнай сесіі пяцікурснікі матэматычнага факультэта. Яе вынікамі, як сказаў намеснік дэкана М. В. Селькін, у дэканаце задаволены. Цяпер студэнты спецыяльнасці «матэматыка» праходзяць у школах педагагічную практыку. Студэнты спецыяльнасці «прыкладная матэматыка» пасля экзаменаў адпачылі на канікулах, пасля чаго набытыя ў аўдыторыях і лабараторыях веды замацуюць на вытворчай практыцы, якую пройдуць на прадпрыемствах і ў канструктарскіх бюро.

Сёння апошні з трох экзаменаў здаюць пяцікурснікі аддзялення эканомікі працы эканамічнага факультэта. З найлепшага боку зарэкамендавалі сябе выхаванцы гр. ЭТ-54. Пераважная большасць з іх маюць толькі добрыя і выдатныя адзнакі. Пасля двух здадзеных экзаменаў самыя высокія балы заслужылі Алена Твардоўская, Таццяна Шаферава, Юрый Клімовіч, Аляксей Нікіфараў і іншыя будучыя эканамісты.

Глыбокімі, грунтоўнымі ведамі радуюць экзаменатараў і многія пяцікурснікі аддзялення АМАЭІ. Свой апошні экзамен яны здадуць 27-га лістапада.

Два экзамены на апошняй сесіі неабходна здаць выпускнікам фізічнага факультэта. Добры прыклад паказала група Ф-52. На экзамене па спецыяльнасці — метадах неразбураючага кантролю, — які прымаў дацэнт А. П. Грыбайла, восем студэнтаў атрымалі выдатныя адзнакі, астатнія — добрыя.

Экзаменацыйная сесія — гэта выпрабаванне не толькі студэнтаў, але і своеасаблівая атэстацыя саміх выкладчыкаў. Па ведах экзаменуемых вызначаецца вынік працы і экзаменатараў. Пажадана, каб гэтыя паказчыкі былі самыя высокія, што з'явіцца дастойным падарункам надыходзячаму знамянальнаму святу — 60-годдзю ўтварэння СССР.

Б. ВАЛОДЗІН.

## ХРОНІКА

Загадам міністра вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР прарэктарам нашага універсітэта па адміністрацыйна-гаспадарчай частцы з 17 лістапада 1982 г. назначаны ШАЎЧЭНКА Уладзімір Аляксандравіч.

Учора на Савеце універсітэта дэканам біялагічнага факультэта выбраны дацэнт АЛЕШКА Сцяпан Фёдаравіч.

Загадам рэктара універсітэта намеснікам дэкана эканамічнага факультэта з 1-га лістапада 1982 г. назначаны кандыдат эканамічных навук ГЕРАСІМЧЫК Мікалай Вікенцьевіч.

## ВІНШУЕМ!

Рэктарат, партком, грамадскія арганізацыі універсітэта, Савет кафедр грамадскіх навук горача віншуюць выкладчыка кафедры філасофіі ЯЦУКА Вікенція Яўгенавіча з выпадку зацвярджэння яго ВАКам у вучонай ступені кандыдата філасофскіх навук.

